УДК 94(476)

# ГРАШОВЫЯ ДАХОДЫ СТАХАНАЎЦАЎ БССР (1935–1941 гг.)

***А. А. Субоцін***
кандыдат гістарычных навук, загадчык кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін
Віцебскі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт

*У артыкуле раскрываецца пытанне грашовага стымулявання працоўнай дзейнасці стаханаўцаў БССР у 1935–1941 гг. Аўтар адзначае, што ўласны бюджэт удзельнікаў стаханаўскага руху фарміраваўся па сукупнасці з павышаных заробкаў, якія былі атрыманы па выніках удасканалення працы, а таксама з прэмій, датацый і грашовых дапамог ад дзяржавы і кіраўніцтва гаспадарчых адзінак. У выніку грашовыя даходы стаханаўцаў былі ў сярэднім больш у 2-3 разы, чым у радавых працоўных, што павінна было замацаваць сацыяльны статус перадавікоў як працоўнай эліты.*

**Ключавыя словы**: стаханаўскі рух, стаханаўцы, БССР, грашовы даход, заработная плата.

## Уводзіны

Ключавым аспектам дзяржаўнай палітыкі сучаснай Беларусі з’яўляецца матэрыяльнае заахвочванне дзейнасці членаў грамадства, такім чынам падтрымліваецца іх актыўнасць пры ажыццяўленні пераўтварэнняў у сацыяльнай сферы, эканоміцы і культуры. Матэрыяльны дастатак вызначае сацыяльнае становішча чалавека і дае яму магчымасць уплываць на розныя бакі жыцця соцыуму. У савецкі перыяд развіцця нашага грамадства не толькі маральнае заахвочванне адыгрывала галоўную ролю пры ацэнцы працоўнай дзейнасці, але грашовае стымуляванне працы павінна было стаць яскасным паказчыкам дабрабыту [1, с. 200]. Яскрава такая тэндэнцыя праявіла сябе ў высокім узроўні грашовых даходаў удзельнікаў сацыялістычнага спаборніцтва ў выніку перавыканання імі вытворчых норм і дасягнення новых вытворчых рэкордаў. У сярэдзіне 1930-х гг., калі свой пачатак узяў стаханаўскі рух, на прыкладзе яго ўдзельнікаў партыйныя і дзяржаўныя органы ставілі мэту паказаць эталон працоўнага чалавека, які павінен быў мець разам з выдатнымі вытворчымі поспехамі адпаведны высокі ўзровень заработнай платы.

Асаблівасці грашовага стымулявання працы стаханаўцаў у народнай гаспадарцы як фактар развіцця сацыялістычнага спаборніцтва не знайшлі свайго падрабязнага адлюстравання ў працах гісторыкаў. Гэта праблема ў савецкай гістарычнай навуцы традыцыйна разглядалася толькі праз прызму прывядзення асобных прыкладаў высокіх заробкаў перадавікоў як пацвярджэнне тэзіса пра паляпшэнне матэрыяльнага становішча рабочых і калгаснікаў у выніку павышэння прадуктыўнасці працы [2–5]. У сучаснай расійскай гістарыяграфіі пытанні грашовых даходаў удзельнікаў стаханаўскага руху прааналізаваў у сваёй кнізе «Сталинский неонэп» У. З. Раговін. Ён паказаў наступствы павелічэння заработнай платы стаханаўцаў у кантэксце працэсу сацыяльнага расслаення рабочых [6, с. 153–154]. Даследуючы стаханаўскі рух сярод рабочых Маскоўскага электракамбіната, гісторыкі С. У. Жураўлёў і М. Ю. Мухін прыйшлі да высноў, што на адзначаным прадпрыемстве ў працэсе разгортвання сацыялістычнага спаборніцтва назіраліся тэндэнцыі павышэння норм выпрацоўкі разам са зніжэннем тарыфаў пры здзельна-прагрэсіўнай аплаце працы для інтэнсіфікацыі вытворчых працэсаў [7, с. 120–124].

Мэтай дадзенага артыкула з’яўляецца вызначэнне асаблівасцей фарміравання грашовых даходаў стаханаўцаў у БССР на працягу 1935–1941 гг.

## Асноўная частка

Прыярытэтным матэрыяльным стымулам развіцця стаханаўскага руху была грашовая аплата працы. У выніку перавыканання вытворчых заданняў рабочымі ўстанаўлівалася практыка павелічэння іх грашовых акладаў. На гэтую асаблівасць разгортвання сацыялістычнага спаборніцтва звярнуў увагу Сталін у сваіх каментарыях да праекта рэзалюцыі снежаньскага Пленума ЦК УКП(б) 1935 г. Савецкі лідар адзначыў, што павышэнне заробкаў рабочых павінна стаць асноўным фактарам інтэнсіфікацыі вытворчасці [8, арк. 5].

Грашовае заахвочванне працы ўдзельнікаў стаханаўскага руху паказала сваю эфектыўнасць на прадпрыемствах прамысловасці, якія перайшлі на здзельную сістэму аплаты працы. У працэсе правядзення стаханаўскіх кампаній сістэматычна прымянялася прамая здзельная аплата працы, дзе заробак фар-

© Субоцін А. А., 2024

міраваўся ў прамой залежнасці ад колькасці выпушчаных адзінак прадукцыі па дакладна вызначаных тарыфах. Прымяненне адзначанай сістэмы аплаты працы, для прыкладу, можна было назіраць у студзені 1936 г. на Барысаўскім аўчынна-шубным заводзе. Тут лепшы стаханавец Гінзбург, выпрацаваўшы 734 адзінкі прадукцыі (183,5% плана), атрымліваў сярэднюю дзённую заработную плату памерам у 6,21 руб. пры тарыфнай стаўцы 4,80 руб., стаханавец Саладоўнік выпрацаваў 400 адзінак прадукцыі (230% плана) і атрымліваў за гэта сярэдні дзённы заробак памерам у 8,32 руб. [9, арк. 146].

Распаўсюджанай пры грашовым стымуляванні стаханаўцаў становіцца здзельна-прэміяльная сістэма, якая прадугледжвала ацэнку вынікаў працы па прамых тарыфах і прэміяльныя налічэнні за перавыкананне як колькасных, так і якасных паказчыкаў. Налічэнне прэміяльных было значным матэрыяльным стымулам для ўключэння ў стаханаўскі рух і выклікала ў працоўных не толькі жаданне павысіць колькасць выпускаемай прадукцыі, але і зменшыць яе брак, не дапусціць прастоі на вытворчых аперацыях, зэканоміць сыравіну, вынайсці наватарскія метады працы. На Рудабельскім спіртзаводзе ў снежні 1935 г. у выніку прымянення падобнай сістэмы заработная плата стаханаўцаў вырасла ў сярэднім па прадпрыемстве да 200% і вышэй [10, арк. 13–13 адв.]. У лютым 1936 г. удзельнікі стаханаўскага руху гарбарнага завода «Бальшавік» атрымалі наступныя прэміяльныя налічэнні за якасныя паказчыкі працы: Бенгіс – 23,4 руб., Алешка – 6,95 руб., Гурвіч – 18,4 руб., Шамес – 15,2 руб., Тарасевіч – 14,6 руб. [11, арк. 83].

Па меркаванні кіраўніцтва БССР, пры ацэнцы перадавой працы ўдзельнікаў стаханаўскага руху перш за ўсё неабходна было ўводзіць здзельна-прагрэсіўную сістэму. Прымяненне здзельна-прагрэсіўнай сістэмы прадугледжвае, што прадукцыя, якая выпускаецца ў рамках звычайных норм, ацэньваецца на аснове прамой здзельшчыны, а выпушчаная вышэй за ўстаноўленую норму – ужо па прагрэсіўных тарыфах. У адпаведнасці з Пастановай Пленума ЦК КП(б)Б ад 17 студзеня 1936 г. такая сістэма аплаты працы ўстанаўлівалася як абавязковая мера разгортвання сацыялістычнага спаборніцтва [12, с. 195]. Рэалізацыя адзначанай вышэй Пастановы на практыцы праявіла сябе ў арганізацыі і правядзенні галіновых канферэнцый у першай палове 1936 г. У выніку працы канферэнцый ужо на працягу мая – чэрвеня 1936 г. здзельна-прагрэсіўная сістэма аплаты працы прымянялася ў БССР сярод 28,8% рабочых мясцовай прамысловасці, у тым ліку ў вапнавай прамысловасці – сярод 62,5% рабочых, у цагельнай – сярод 59,4%, у тарфяной – сярод 77% [13, с. 39].

У асобных галінах прамысловасці стала прымяняцца шматступенная здзельна-прагрэсіўная сістэма. У межах такой сістэмы стаханаўцы дэферэнцавана атрымлівалі даплаты за адзінкі прадукцыі, якія былі выпушчаны імі звыш устаноўленых вытворчых норм. Пры гэтым працэнт перавыканання прапарцыянальна ўплываў на павышэнне расцэнак [14, с. 25]. Напрыклад, згодна з рашэннямі галіновай канферэнцыі Беларускага дзяржаўнага трэста металаапрацоўчай прамысловасці, станкабудаўнічыя заводы павінны былі выкарыстоўваць наступную схему выплат: калі на асноўных аперацыях выпрацоўваліся нормы ад 101 да 120%, тарыфы павышаліся на 50%, пры выпрацоўцы норм ад 121 да 150% тарыфы выраcталі на 100%, пры выпрацоўцы норм на 151% і вышэй – на 150% [15, арк. 202]. У гарбарнай вытворчасці расцэнкі па шматступеньчатай здзельна-прагрэсіўнай сістэме раслі наступным чынам: перавыкананне планаў на 101–120% прыводзіла да павышэння аплаты на 20%, перавыкананне на 121–150% – на 60%, перавыкананні на 150% і вышэй – на 100% [15, арк. 218]. Кіраўніцтва кандытарскіх прадпрыемстваў БССР за выкананне норм больш чым на 120% устанаўлівала нормы даплат памерам вышэй за 20% [16, арк. 62]. На працягу трэцяй пяцігодкі згаданая намі вышэй сістэма аплаты працы стабільна знаходзіць сваё прымяненне ў ходзе разгортвання руху шматстаночнікаў і сумяшчэння прафесій. Стаханаўцы харчовай прамысловасці рэспублікі са студзеня 1940 г. пры ўключэнні ў дадзены рух маглі дадаткова атрымліваць 25–50% тарыфнай стаўкі за месяц [17, арк. 3].

Частка прадпрыемстваў прамысловасці для сваіх стаханаўцаў уводзілі камбінаваныя формы аплаты працы, якія спалучалі ў сабе элементы прагрэсіўнай і прэміяльнай сістэм. Пры дадзеным спалучэнні прагрэсіўныя даплаты маглі рабіцца за перавыкананыя планавыя паказчыкі, а таксама выдавацца ў выглядзе прэміяльных за паказчыкі па фактах зніжэння браку і ў выніку эканоміі сыравіны. Такая своеасаблівая прагрэсіўна-прэміяльная сістэма аплаты працы прымянялася, напрыклад, з пачатку 1936 г. на Мінскай скургалантарэйнай фабрыцы імя Куйбышава. Тут за

прадукцыю, выпушчаную звыш плана, дадаткова выдаваліся прэміі за эканомію сыравіны. Гэтыя прэміі напрамую залежалі ад працэнта выканання нормаў. Напрыклад, стаханаўцы, якія выконвалі вытворчыя заданні на 115% і вышэй пры эканоміі саравіны ў межах 1-2% дадаткова атрымлівалі прэмію 2,5% ад стаўкі, пры эканоміі 2-3% атрымлівалі 3% стаўкі, пры 3-4% – 4%, пры 4-5% – 5%, пры 5% і вышэй – 6% [15, арк. 217].

У ходзе прымянення разнастайных варыяцый здзельнай аплаты працы заробак рабочых, што прымалі ўдзел у стаханаўскай форме сацыялістычнага спаборніцтва, вырас па прамысловых прадпрыемствах прыкладна ў 2-3 разы. Гэта стала стабільнай матэрыяльнай базай для захавання ўстаноўленых вытворчых тэмпаў. Напрыклад, дзённы заробак стаханаўца Самусёнка (Магілёўскі машынабудаўнічы завод імя Дзімітрава) за верасень 1935 г. – люты 1936 г. вырас з 13,1 руб. да 24,2 руб. у разліку, што перадавік выконваў вытворчыя заданні ў сярэднім да 400%. Стаханавец Бунько з таго ж прадпрыемства выконваў вытворчыя заданні ў сярэднім на 250 % і павысіў свой дзённы заробак з 8,3 руб. да 12,8 руб. за 5 месяцаў [18, арк. 165]. Перад тым як уключыцца ў стаханаўскі рух, работніца кандытарскага камбіната «Спартак» Худзякова мела сярэднюю заработную плату за месяц да 80 руб., у выніку ж прымянення перадавых метадаў працы са снежня 1936 г. дасягнула заробку памерам ад 280 да 290 руб. [19, арк. 46]. Рабочы Парфёнаў з торфазавода «Асінторф» за май 1938 г. атрымаў заробак памерам у 1100 руб., пры перавыкананні норм у чэрвені таго ж года атрымаў ужо 1588 руб. [20, арк. 81].

Дзякуючы здзельнай сістэме аплаты працы рост заробкаў можна было назіраць і ў стаханаўцаў саўгасаў у выніку перавыканання паказчыкаў сельскагаспадарчай вытворчасці. Напрыклад, рабочы Ражаеў з саўгаса «Арловічы» (Віцебскі раён) за кошт прымянення стаханаўскіх метадаў працы у кастрычніку 1935 г. атрымаў заробак памерам у 110 рублёў, што было на 30 рублёў вышэй за яго папярэднюю заработную плату [21, арк. 6]. Работніца Гуцава з саўгаса імя Ланге Добрушскага раёна пры звычайным выкананні норм атрымлівала за месяц 80 рублёў, а калі стала працаваць па-стаханаўску і выконвала нормы да 200%, атрымала за май 1936 г. 183 руб. [22, с. 33].

У калектыўных гаспадарках уключэнне сялян у стаханаўскі рух прыводзіла да росту ўлічаных працадзён і, як вынік, да адпаведнага налічэння большых грашовых сум. Так, лепшай стаханаўцы калгаса імя Леніна Бабруйскага раёна Шыло выдалі грашовую суму памерам у 1000 руб. за 1936 г. па выніках выпрацаваных 700 працадзён [23, арк. 27]. Стаханаўцы Альховік з Клічаўскага раёна па выніках 1939 г. выдалі грашовую аплату за працадні памерам у 1500 руб. [24, с. 16]. Частка калгасаў заахвочвала сялян да ўдзелу ў стаханаўскім руху праз прымяненне здзельна-прагрэсіўнай сістэмы аплаты працы. У Аршанскім раёне калгас «Брыгадзір» у 1936 г. устанавіў сістэму грашовай аплаты працы на льноуборачных аперацыях прапарцыянальна працэнту перавыканання норм. Напрыклад, апрацаваныя звыш нормы 0,01 га аплачваліся дадаткова 50 кап., 0,02 га – 1 руб., 0,03 га – 3 руб., 0,04 га – 4 руб. і г. д. [25, с. 9]. Канешне, калі параўноўваць аплату працы стаханаўцаў на прамысловых прадпрыемствах, то яна была на парадак вышэй, чым у сельскай гаспадарцы, але і мінімальныя вылучэнні грошай стаханаўцам вёскі з’яўляліся важным сродкам заахвочвання далейшага ўдзелу ў сацыялістычным спаборніцтве.

Даход удзельнікаў стаханаўскага руху апрача тых грошай, якія яны атрымлівалі непасрэдна за перадавую працу, папаўняўся яшчэ і дадатковымі выплатамі ў форме грашовых прэмій ад адміністрацыі гаспадарчых адзінак, рэспубліканскага і саюзнага кіраўніцтва, прэмій з нагоды асобных грамадска-палітычных мерапрыемстваў і святаў. У лістападзе 1935 г. у гонар пяцігадовага юбілею Магілёўскай шаўковай фабрыкі для ўзнагароды яе лепшых перадавікоў была вылучана грашовая сума памерам у 90 тыс. руб. [26, с. 1]. Стаханаўка Блох з Барысаўскай запалкавай фабрыкі падчас галіновага злёту ўдзельнікаў стаханаўскага руху ў Маскве ў 1936 г. атрымала прэмію памерам у 250 руб. ад кіраўніцтва народнага камісарыята лясной прамысловасці СССР [27, с. 20]. Па выніках укаранення стаханаўскіх метадаў працы ў аграрным сектары таксама ўстанавілася практыка вылучэння героям вытворчасці дадатковых прэмій. Напрыклад, згодна з рашаннем Цэнтральнай конкурснай камісіі Народнага камісарыята збожжавых і жывёлагадоўчых саўгасаў СССР, у лістападзе 1935 г. быў прэміраваны лепшы стаханавец саўгаса «Замошша» Мінскага свінагадоўчага трэста Ф. Жукоўскі. Перадавік атрымаў дзяржаўную грашовую прэмію памерам у 250 руб. [21, арк. 48 адв.]. Сумы ў

памерах 100–500 руб. у 1938 г. з нагоды свята 1 Мая атрымалі лепшыя ўдзельнікі стаханаўскага руху з Заслаўскай МТС [28, арк. 75]. 48 найлепшых удзельнікаў стаханаўскага руху жывёлагадоўлі былі прэміраваны на агульную суму памерам у 13 тыс. руб. ад Народнага камісарыята земляробства БССР у верасні 1938 г. [29, с. 4]. У ліпені 1939 г. заслужаныя даяркі Каршова і Бярозкіна былі прэміраваны кіраўніцтвам БССР за выдатную працу ў памеры 100 руб. кожнай [30, с. 2].

Стаханаўцы ў якасці спецыяльных прывілей атрымлівалі грашовую дапамогу, датацыі ад прафсаюзных арганізацый і адміністрацый гаспадарчых адзінак для паляпшэння бытавых умоў ці вядзення ўласнай гаспадаркі. Напрыклад, у снежні 1935 г. Віцебскі шчацінна-шчотачны камбінат праз касу ўзаемадапамогі незваротна выдзеліў 75 руб. для стаханаўца Мямухіна і 90 руб. для стаханаўкі Каждан, з грашовых фондаў фабрычнага камітэта лепшым удзельнікам стаханаўскага руху выплацілі 395 руб. [31, арк. 305]. У лютым 1936 г. фабрыка «Сцяг індустрыялізацыі» ажыццявіла дапамогу ў грашовым эквіваленце для 76 стаханаўцаў [19, арк. 116]. Ад Беларускага рэспубліканскага камітэта Саюза мясамалочных саўгасаў стаханаўка Крошкіна з саўгаса «Адаменкі» ў студзені 1938 г. атрымала грашовую дапамогу памерам у 300 руб. для таго, каб купіць карову ва ўласную гаспадарку [32, арк. 4].

Такім чынам, удзельнікі стаханаўскага руху ў параўнанні з іншымі працоўнымі распараджаліся значна большымі сумамі грошай. Сістэма грашовага стымулявання працы перадавікоў прыводзіла да ўсталявання дыферэнцыраваных даходаў сярод рабочых і калгаснікаў. Так, у канцы 1935 г. заробак у стаханаўца Пясоцкага (Віцебскі станкабудаўнічы завод імя Кірава) быў на 302% вышэй за сярэдні заробак рабочых прадпрыемства. Стаханавец Стралецкі з таго ж завода меў заробак на 238% больш за сярэдні, стаханавец Пляшкевіч – на 225% [33, арк. 47]. Адзін з лепшых стаханаўцаў БССР Г. Скабло за лістапад 1935 г. меў грашовы даход памерам у 540 руб., за снежань таго ж года – у 624 руб. З улікам прэміі за лістапад на суму 500 руб. і 1000 руб. за снежань, якія былі выдзелены на жыллёва-камунальныя патрэбы, Скабло атрымаў за пералічаныя вышэй месяцы 1040 руб. і 1624 руб. адпаведна [34, с. 85].

## Заключэнне

Падчас другой і трэцяй пяцігодак грашовае стымуляванне стала ключавым фактарам удзелу рабочых і калгаснікаў у стаханаўскім руху. Грашовыя даходы стаханаўцаў БССР былі самыя высокія сярод усіх працоўных, што прадвызначалася прымяненнем розных форм здзельнай аплаты працы, якія якраз і пачалі ўводзіцца на прадпрыемствах па асобных галінах у межах кампаній разгортвання стаханаўскага руху. Пры здзельнай сістэме высокапрадуктыўная праца стаханаўцаў ацэньвалася максімальна эфектыўна, калі ўлічваліся як колькасныя, так і якасныя паказчыкі выпускаемай прадукцыі, а таксама вызначаўся дыферэнцыраваны падыход пры перавыкананні вытворчых планаў. У сельскай гаспадарцы ўзровень грашовага стымулявання быў на парадак ніжэй і здзельная аплата працы прымянялася тут пераважна ў адносінах да рабочых-стаханаўцаў саўгасаў. Даходы стаханаўцаў калгасаў залежалі ад колькасці выкананых імі працадзён. Апошнія аплачваліся нязначнымі сумамі па выніках года. Фінансавае становішча ўдзельнікаў стаханаўскага руху вызначалася грашовымі сродкамі, атрыманымі за павышэнне прадукцыйнасці працы, разнастайнымі прэміямі, датацыямі і дапамогамі ад дзяржаўных структур і непасрэдна ад гаспадарчых кіраўнікоў.

## *СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ*

1. ***Лукассен, Я.*** Мотивация труда в исторической перспективе: некоторые предварительные заметки по терминологии и принципам классификации / Я. Лукассен // Социальная история : ежегодник / Москов. гос. ун-т им. М. В. Ломоносова, Центр эконом. истории при ист. фак., Рос. акад. наук, Ин-т рос. истории, Гр. «Социально-экономическая история: экономика и общество». – М., 2002. – С. 194–205.

2. ***Малинин, С. Н.*** Рост материального и культурного уровня трудящихся БССР / С. Н. Малинин, Я. Г. Раков. – Минск : Изд-во Акад. наук БССР, 1939. – 124 с.

3. ***Рогачевская, Л. С.*** Социалистическое соревнование в СССР : историч. очерки. 1917–1970 / Л. С. Рогачевская. – М. : Наука, 1977. – 352 с.

4. ***Сахаров, В. А.*** Зарождение и развитие стахановского движения (на материалах автотракторной промышленности) / В. А. Сахаров. – М. : Изд-во МГУ, 1985. – 120 с.

5. История рабочего класса Белорусской ССР : в 4 т. / редкол.: М. П. Костюк (отв. ред.) [и др.]. – Минск : Наука и техника, 1984–1987. – Т. 2 : Рабочий класс БССР в годы Великой Октябрьской социалистической революции и построения социализма (1917–1937) / И. М. Игнатенко [и др.]. – 1985. – 488 с.

6. ***Роговин, В.*** Сталинский неонэп / В. Роговин. – М. : Журн. «Театр», 1994. – 384 с.

7. ***Журавлёв, С. В.*** «Крепость социализма»: повседневность и мотивация труда на советском предприятии, 1928–1938 гг. / С. В. Журавлёв, М. Ю. Мухин. – М. : РОССПЭН, 2004. – 240 с.

8. Расійскі дзяржаўны архіў сацыяльна-палітычнай гісторыі. – Ф. 558. Воп. 1. Спр. 3191.

9. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 265. Воп. 1. Спр. 4313.

10. НАРБ. – Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 8966.

11. НАРБ. – Ф. 283. Воп. 1. Спр. 694.

12. Коммунистическая партия Белоруссии в резолюциях и решениях съездов и пленумов ЦК : в 6 т. / Ин-т истории при ЦК КПБ ; редкол.: Г. Г. Барташевич (гл. ред. [и др.]. – Минск : Беларусь, 1983–1987. – Т. 3. – 1985. – 551 с.

13. ***Дукар, З.*** Мясцовая прамысловасць БССР да гадавіны стаханаўскага руху / З. Дукар // Сацыялістычнае будаўніцтва. – 1936. – № 6–7. – С. 34–41.

14. Галіновыя канферэнцыі мясцовай прамысловасці // Сацыялістычнае будаўніцтва. – 1936. – № 3 – С. 23–28.

15. НАРБ. – Ф. 265. Воп. 1. Спр. 4455.

16. Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі. – Ф. 5451. Воп. 19. Спр. 249.

17. НАРБ. – Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 16054.

18. НАРБ. – Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 10776.

19. Дзяржаўны архіў Гомельскай вобласці. – Ф. 426. Воп. 1. Спр. 264.

20. НАРБ. – Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 14029.

21. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці (ДАВВ). – Ф. 932. Воп. 1. Спр. 349.

22. ***Гуцава, Г. П.*** За 4000 літраў малака ад каровы / Г. П. Гуцава. – Мінск : Дзярж. выд-ва Беларусі, 1937. – 36 с.

23. Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Магілёўскай вобласці. – Ф. 2952. Воп. 1а. Спр. 407.

24. ***Сідаровіч, М.*** Стаханаўская праца аплачваецца багата / М. Сідаровіч // Работніца і калгасніца Беларусі. – 1940. – № 2. – С. 16.

25. За 26-ы нумар ільновалакна / С. Палітыка [і інш.]. – Мінск : Дзярж. выд-ва Беларусі, 1936. – 34 с.

26. Святкаванне юбілея на фабрыцы // Звязда. – 1935. – 24 лістап. – С. 1.

27. Стаханаўскім шляхам: стаханаўцы Барысаўскай запалкавай фабрыкі : [зб. арт.]. – Мінск : Дзярж. выд-ва Беларусі, 1936. – 64 с.

28. Дзяржаўны архіў Мінскай вобласці. – Ф. 493. Воп. 1. Спр. 25.

29. Прэміраванне стаханаўцаў-перадавікоў жывёлагадоўлі // Звязда. – 1938. – 10 верас. – С. 4.

30. ***Пашковская.*** День отдыха стахановцев / Пашковская // Рабочий. – 1935. – 16 дек. – С. 2.

31. НАРБ. – Ф. 283. Воп. 1. Спр. 674.

32. НАРБ. – Ф. 297. Воп. 1. Спр. 173.

33. ДАВВ. – Ф. 102. Воп. 1. Спр. 365.

34. Народна-гаспадарчы план 1936 стаханаўскага года // Сацыялістычнае будаўніцтва. – 1936. − № 1–2. – С. 15–85.

Паступіў у рэдакцыю 14.03.2024 г.

Кантакты: subotsin@mail.ru (Субоцін Аляксандр Аляксандравіч)

***Subotsin A. A.*** **MONEY INCOMES OF THE STAKHANOVISTS IN THE BSSR (1935–1941)**

*The article reveals the issue of monetary incentives for the labor activity of the Stakhanovists of the BSSR in 1935–1941. The author notes that the personal budget of the participants of the Stakhanov movement was formed as an aggregate of the increased earnings that were received as a result of improved work and bonuses, grants and monetary assistance from the state and the management of economic units. As a result, the monetary incomes of the Stakhanovists were on average 2–3 times higher than those of ordinary workers, this was supposed to consolidate the social status of the leading workers as the labor elite.*

**Keywords:** the Stakhanov movement, the Stakhanovists, the BSSR, money income, wage.